ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
21.06.2021 № 131

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

(базавы ўзровень)

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ГЛАВА 1

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» (далей — вучэбная праграма) прызначана для вывучэння на базавым узроўні вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» ў XI класе ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 53 вучэбныя гадзіны (1/2 гадзіны на тыдзень).

3. **Мэта** вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» — далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядамі, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрымаць прыгожае і выкарыстоўваць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

4. **Задачы** вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура»:

- фарміраванне ў вучняў ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць самастойнае засваенне мастацка-эстэтычных, духоўна-маральных каштоўнасцей;
- фарміраванне літаратурнай кампетэнцыі — сістэматызацыя ведаў пра літаратуру як цэласнасць, прадстаўленую ў выглядзе паняццяў і спосабаў дзейнасці;
- фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі, развіццё ўяўленняў пра літаратуру як сацыякультурны феномен;

- фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, якая раскрывае камунікатыўную прыроду тэксту, дзе наладжаны дыялог паміж героямі, аўтарам і чытачом, адзінкавым тэкстам і мноствам кантэкстаў;
- фарміраванне культуратворчай кампетэнцыі — сістэмы цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, гэта значыць навучанне дзейнасці праз уключэнне ў гэтую дзейнасць.

5. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання і выхавання: семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі, праекты і інш. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем да ўсіх метадаў навучання з'яўляецца сарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Структура ўрокаў беларускай літаратуры і іх форма абумоўліваюцца мэтавымі ўстаноўкамі, узростам вучняў, мастацкай своеасаблівасцю твора, этапамі яго вывучэння. Гутарка і лекцыя, чытанне і абагульненне, аналіз і сачыненне, абарона праектаў і завочная экскурсія, «паэтычная хвілінка» і работа з вучэбным дапаможнікам — гэтыя формы навучання маюць сваю спецыфіку, якая праяўляецца ва ўнутранай логіцы разгортвання ўрока, і забяспечваюць такія яго якасці, як цэласнасць, навучальная, выхаваўчая і развіццёвая накіраванасць, праблемнасць, дзейнасны характар, дыялагічнасць.

Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай

тэмы, а таксама патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме.

6. Змест літаратурнай адукацыі ў XI класе пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе прадоўжыць знаёмства вучняў, якое пачалося ў IX— X класах, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання ў вучняў інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў дадзеную вучэбную праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, якая адпавядае асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені навучання паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

Прапанаваны дадзенай вучэбнай праграмай змест аглядавых і манаграфічных тэм мае арыентацыйны характар: тут акрэсліваюцца праблемы і ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік засяроджваецца на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, вывучэнне якіх ён лічыць больш дарэчным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

Рэзерв вучэбнага часу настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні — на чытанне і асэнсаванне літаратурных твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з каляндарна-тэматычным планаваннем.

ГЛАВА 2

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1960-х — ПАЧАТКУ 1990-х гг.

(34 гадзіны)

### Развіццё беларускай літаратуры ў 1960-х — пачатку 1990-х гг. Агляд (1 гадзіна)

Літаратура ва ўмовах новай грамадскай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення.

Узбагачэнне светабачання беларускіх паэтаў, іх жанрава-стылёвыя пошукі (Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц, Ніна Мацяш, Раіса Баравікова, Алесь Разанаў, Генадзь Пашкоў, Казімір Камейша і інш.). Грамадзянскасць і маральна-этычная скіраванасць пафасу паэтычнай творчасці. Павышаная цікавасць да філасофскіх праблем, складаных пытанняў чалавечага жыцця.

Тэматыка і праблематыка беларускай прозы (Васіль Быкаў, Іван Мележ, Іван Шамякін, Іван Навуменка, Міхась Стральцоў, Віктар Казько, Іван Пташнікаў, Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Генрых Далідовіч, Вячаслаў Адамчык, Віктар Карамазаў, Алесь Жук, Георгій Марчук і інш.).

Здабыткі ў жанрах драмы і камедыі (п'есы Андрэя Макаёнка, Алеся Петрашкевіча, Міколы Матукоўскага, Аляксея Дударава, Георгія Марчука і інш.). Праблемнасць, канфліктная аснова твораў беларускіх драматургаў.

**І в а н  Ш а м я к і н.** Раман **«Сэрца на далоні»** *(4 гадзіны)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць (з абагульненнем раней вывучанага).

«Сэрца на далоні». Праблематыка рамана. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Вастрыня канфлікту. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз кар'ерыста Гукана. Вобраз Зосі Савіч, яе жыццёвы лёс.

Маладое пакаленне ў рамане. Няўстойлівасць жыццёвай пазіцыі Славіка Шыковіча. Складаны шлях духоўнага станаўлення Тараса. Праблема ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, неабходнасць выхавання маладога пакалення. Сімволіка назвы твора.

***Тэорыя літаратуры.*** Жанр рамана (паглыбленне паняцця).

***Мастацтва.***[1] Ж ы в а п і с: *Міхась Будавей.* «Партрэт Івана Шамякіна»; *Уладзімір Масленікаў.* «Мае бацькі ў маі 1945 года».

Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а: спектаклі «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі» (па творах Івана Шамякіна).

К і н а м а с т а ц т в а: мастацкія фільмы «Гандлярка і паэт» (рэжысёр *С. Самсонаў*), «Вазьму твой боль» (рэжысёр *М. Пташук*).

**А н д р э й  М а к а ё н а к. «Зацюканы апостал»** *(2 гадзіны)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць драматурга.

«Зацюканы апостал». Жанравая адметнасць п'есы. Спалучэнне ў творы камічнага і трагічнага. Умоўнасць часу і месца дзеяння. Характарыстыка персанажаў, іх сімвалічнасць і падкрэсленая абагульненасць. Маральна-этычны змест камедыі, сцвярджэнне аўтарам духоўных агульначалавечых каштоўнасцей. Майстэрства Андрэя Макаёнка ў абмалёўцы характараў.

***Тэорыя літаратуры.*** Трагікамедыя. Моўная характарыстыка персанажаў (паглыбленне паняцця).

***Мастацтва.*** Ж ы в а п і с: *Міхась Будавей.* «А. Макаёнак».

Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а: спектакль «Зацюканы апостал» (рэжысёр *Б. Луцэнка*).

---

[1] Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца ў першую чаргу з апорай на вядомае і на выбар настаўніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі дадзенай вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

**Я н к а  Б р ы л ь.** Лірычныя мініяцюры **«Загадка»**, **«Трохі пра вечнае»** *(1 гадзіна)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка (з абагульненнем раней вывучанага).

Жанр міні-прозы ў творчасці Янкі Брыля. Паэзія «імгненняў жыцця». Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў «малой прозе». Ідэя разнастайнасці жыцця і яго праяў у творчасці.

***Тэорыя літаратуры.*** Паняцце пра лірычную прозу.

***Мастацтва.*** Ж ы в а п і с: *Міхась Будавей.* «Партрэт Я. Брыля».

**В а с і л ь  Б ы к а ў.** Аповесць **«Знак бяды»** *(5 гадзін)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка (з абагульненнем раней вывучанага).

«Знак бяды». Актуальнасць маральна-філасофскай праблематыкі аповесці. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў — Петрака і Сцепаніды. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Мастацкая сімволіка твора. Значэнне творчасці В. Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

***Тэорыя літаратуры.*** Вобразы-сімвалы, мастацкія дэталі, іх роля ў тэксце (паглыбленне паняццяў).

***Мастацтва.*** Ж ы в а п і с: *Міхась Будавей.* «Партрэт В. Быкава»; *Май Данцыг.* «Партрэт В. Быкава»; *Арлен Кашкурэвіч.* Ілюстрацыі да аповесцей Васіля Быкава «Пайсці і не вярнуцца», «Яго батальён»; *Георгій Паплаўскі.* Ілюстрацыі да аповесцей Васіля Быкава «Дажыць да світання», «Сотнікаў»; *Уладзімір Тоўсцік.* «Васілю Уладзіміравічу Быкаву прысвячаецца», «Васілёва зорка»: альбом.

К і н а м а с т а ц т в а: «Знак бяды» (рэжысёр *М. Пташук*).

**У л а д з і м і р  К а р а т к е в і ч.** Раман **«Каласы пад сярпом тваім»** *(5 гадзін)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка (з абагульненнем раней вывучанага).

«Каласы пад сярпом тваім». Гістарычная аснова рамана. Прадстаўнікі дваранства ў рамане (Даніла Вежа-Загорскі, Хаданскія, Кроер). Вобразы сялян у рамане. Праўдзівасць адлюстравання

чалавечых характараў. Духоўны воблік галоўнага героя рамана Алеся Загорскага. Хараство кахання Алеся Загорскага і Майкі Раўбіч. Вобразная сімволіка.

***Тэорыя літаратуры.*** Рамантычнае і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры (паглыбленне паняццяў).

***Мастацтва.*** М у з ы к а: *Яўген Глебаў.* Раманс «Любы мой»; *Ларыса Мурашка.* Раманс «Дагарэў за брамай небакрай»; *Дзмітрый Смольскі.* Опера «Сівая легенда».

С к у л ь п т у р а: *Сяргей Вакар.* «Пісьменнік У. Караткевіч».

Ж ы в а п і с: *Леанід Дударанка.* «Беларускія пісьменнікі. Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Ніл Гілевіч».

К і н а- і т э л е м а с т а ц т в а: тэлеспектакль «Лісце каштанаў»; фільмы: «Будзь шчаслівa, рака» (сцэнарыст *У. Караткевіч*), «Быў, ёсць, буду» (сцэнарыст і рэжысёр *Ю. Цвяткоў*), «Кнiганошы» (рэжысёр *У. Трацянкоў*), «Ладдзя роспачы» (рэжысёр *Л. Тарасаў*), «Лісце каштанаў» (рэжысёр *У. Забэла*).

**М і х а с ь С т р а л ь ц о ў.** Апавяданне **«Сена на асфальце»** *(2 гадзіны).*

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

«Сена на асфальце». Тэматыка, ідэйны пафас. Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобраз аўтара-апавядальніка і іншых герояў твора. Адметнасць кампазіцыі. Лірызм стылю. Прырода ў творы.

***Тэорыя літаратуры.*** Унутраны маналог як сродак раскрыцця характараў герояў.

**Н і л Г і л е в і ч.** Вершы **«Край мой беларускі, край!..», «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...»**; раман у вершах **«Родныя дзеці»** *(4 гадзіны).*

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Лірыка. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны, паэтызацыя прыроды — асноўныя тэмы паэзіі Ніла Гілевіча. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў лірыцы паэта.

«Родныя дзеці». Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Другарадныя вобразы і іх роля ў творы. Сюжэтна-кампазіцыйная структура. Значэнне лірычных адступленняў.

***Тэорыя літаратуры.*** Раман у вершах.

***Мастацтва.*** Ж ы в а п і с: *Мікалай Андруковіч.* «Лагойскі краявід»; *Мікалай Бушчык.* «Відная ноч».

Г р а ф і к а: *А. Лапіцкая.* «Гучаць над Палессем старажытныя песні».

М у з ы к а: *Эдуард Зарыцкі.* Песня «Палыновая ростань» (словы *Н. Гілевіча*); *Леанід Захлеўны.* Песня «Сонца ў азерцы» (словы *Н. Гілевіча*); *Ігар Лучанок.* Песня «Я хаджу закаханы» (словы *Н. Гілевіча*); *Эдуард Ханок.* Песня «Вы шуміце, бярозы...» (словы *Н. Гілевіча*); «Аксамітавы вечар»: кампакт-дыск; «Нашы песні»: кампакт-дыск (ансамбль *«Сябры»*).

**І в а н Ч ы г р ы н а ў.** Апавяданне **«Дзівак з Ганчарнай вуліцы»** *(1 гадзіна).*

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

«Дзівак з Ганчарнай вуліцы». Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Вобраз героя-апавядальніка.

**І в а н Н а в у м е н к а.** Апавяданне **«Сямнаццатай вясной»** *(1 гадзіна).*

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

«Сямнаццатай вясной». Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеду. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

***Тэорыя літаратуры.*** Сюжэт і яго элементы (паглыбленне паняццяў).

**Р ы г о р Б а р а д у л і н.** Вершы **«Неруш», «Яна адна, зямля вякоў...», «Бацьку», «Заспаная раніца мжыстая...», «Чалавек не ўзнікае так...»** *(3 гадзіны).*

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Паэтычныя вобразы Радзімы, зямлі бацькоў і беларускага народа ў паэзіі Рыгора Барадуліна. Услаўленне роднага слова як духоўнай святыні. Роздум пра сэнс чалавечага жыцця і повязь пакаленняў. Асабістае і агульначалавечае ў вершах паэта. Асаблівасці паэтычнага майстэрства Рыгора Барадуліна.

***Тэорыя літаратуры.*** Паняцце пра асацыятыўнасць у літаратуры. Метафара, сінекдаха, перыфраз (паглыбленне паняццяў).

**А л е с ь  Р а з а н а ў.** Вершы **«Радзіма...»**, **«Кожны народ мае...»**, **«У крузе»**, **«Спадчына»**, **«Горад»** *(1 гадзіна)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Адметнасць творчай індывідуальнасці. Жанрава-стылёвыя асаблівасці лірыкі. Асацыятыўная вобразнасць. Роля Алеся Разанава ў развіцці сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі.

***Тэорыя літаратуры.*** Жанравыя пошукі сучаснай беларускай паэзіі: традыцыі і наватарства.

**Г е о р г і й  М а р ч у к.** Навелы **«Канон Гарыні»**, **«Канон Маці»** *(1 гадзіна)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка.

Жанрава-стылёвая спецыфіка твораў. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Мудрасць разумення чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

***Тэорыя літаратуры.*** Апавяданне і навела як эпічныя жанры (паглыбленне паняццяў).

***Мастацтва.*** К і н а м а с т а ц т в а: фільм «Ліст да Феліні» (рэжысёр *Д. Зайцаў*).

**А л я к с е й  Д у д а р а ў.** П’еса **«Князь Вітаўт»** *(2 гадзіны)*.

Звесткі пра жыццё і творчасць драматурга.

«Князь Вітаўт». Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага. Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Маральнаэтычнае завастрэнне канфлікту. Праблема асабістага шчасця ў п’есе. Сцвярджэнне ў творы галоўных каштоўнасцей на зямлі: любові, еднасці, згоды і міру.

***Тэорыя літаратуры.*** Гістарычная драма.

***Мастацтва.*** Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а: спектаклі «Князь Вітаўт» (рэжысёры *В. Раеўскі, Б. Герлаван*), «Радавыя» (рэжысёры *В. Раеўскі, Б. Герлаван*), «Чорная панна Нясвіжа» (рэжысёры *В. Раеўскі, Б. Герлаван*).

**М і х а с ь  Б а ш л а к о ў.** Верш **«Заркапад», цыкл вершаў «Радзіма...»** *(1 гадзіна).*

Звесткі пра жыццё і творчасць паэта.

Свет Радзімы-Беларусі ў творчасці паэта, выяўленне пачуцця любові да зямлі бацькоў. Знітаванасць з родным краем як духоўная аснова ўнутранага свету лірычнага героя. Філасофскі роздум пра хуткаплыннасць часу і сэнс чалавечага жыцця. Задушэўнасць інтанацыі, меладычнасць, тонкі лірызм вершаў.

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. АГЛЯД
(11 гадзін)

**Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе.** Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Утварэнне і дзейнасць грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі», яго супрацоўніцтва з пісьменнікамі іншых краін свету. Творчасць пісьменнікаў-землякоў. Літаратурна-мастацкая перыёдыка (часопісы «Полымя», «Маладосць» і інш.) *(3 гадзіны).*

**Паэзія** (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) *(2 гадзіны).*

Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і індывідуальна-асобаснага пачаткаў у творчасці Янкі Сіпакова, Юрася Свіркі, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Раісы Баравіковай, Мар'яна Дуксы, Уладзіміра Карызны і інш. Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі: Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч, Мікола Мятліцкі і інш. Наватарства ў галіне вершаванай формы і іншыя мастацкія пошукі сучаснай паэзіі (Алесь Разанаў, Людміла Рублеўская, Віктар Шніп і інш.).

**Проза** (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) *(4 гадзіны).*

Тэматыка і сацыяльна-філасофская праблематыка сучаснай прозы. Асэнсаванне пісьменнікамі стасункаў асобы і грамадства, повязі часоў і пакаленняў: Алесь Савіцкі. «Пісьмо ў Рай», Уладзімір Сцяпан. Навела «Адна капейка», Іван Чыгрынаў. «Вяртанне да віны», Іван Навуменка. «Вір», Янка Сіпакоў. «Кулак» і інш.

**Драматургія** (у межах агляду вылучаюцца аўтары і творы на выбар настаўніка) *(2 гадзіны).*

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі на сучасным этапе. Узмацненне цікавасці да гістарычнага мінулага ў творчасці Алеся Петрашкевіча, Уладзіміра Бутрамеева, Раісы Баравіковай і інш. Новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі (Ігар Сідарук, Пятро Васючэнка і інш.).

Сучасная драматургія і тэатр.

### **Рэзерв вучэбнага часу** (1 гадзіна)

### **Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год** (1 гадзіна)

У с я г о: на вывучэнне твораў — 47 гадзін;
на творчыя работы — 4 гадзіны;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання — 2 гадзіны.

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

*Міхась Стральцоў*. Урывак з апавядання «Сена на асфальце» (пачынаючы са слоў «О зямля! Ты даеш нам тугу па небе...» і да слоў «...гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога»).

*Ніл Гілевіч*. Верш «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..».

*Рыгор Барадулін*. Верш «Чалавек не ўзнікае так...».

Верш з сучаснай беларускай паэзіі (на выбар вучняў).

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ

### ***Паэзія***

Зборнік «Краіну родную люблю».

Зборнік «Мая Радзіма».

*Міхась Башлакоў*. Зборнік «Далеч вячэрняя».

*Навум Гальпяровіч*. Зборнік «Святло ў акне».

*Васіль Зуёнак*. Зборнік «Лета трывожных дажджоў».

*Анатоль Зэкаў*. Зборнік «Белае сонца бяроз».

*Казімір Камейша*. Зборнік «Гордзіеў вузел».

*Уладзімір Карызна*. Зборнік «Доля — Русь наша Белая».

*Дзмітрый Марозаў*. Зборнік «Вачыма сэрца».

*Генадзь Пашкоў*. Зборнік «У далонях свету».

*Алесь Пісьмянкоў*. Зборнік «Я не памру, пакуль люблю».

*Алесь Разанаў*. Зборнік «У горадзе валадарыць Рагвалод».

*Людміла Рублеўская*. Зборнік «Замак месячнага сяйва».

*Віктар Шніп*. Зборнік «Першы папяровы снег».

### *Проза*

*Генрых Бёль*. «Дом без гаспадара» (ва ўрыўках).

*Васіль Быкаў*. «Сотнікаў».

*Янка Брыль*. Зборнік «З людзьмі і сам-насам».

*Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік*. «Я з вогненнай вёскі...».

*Алесь Жук*. «Душа над чыстым полем».

*Віктар Карамазаў*. «Крыж на зямлі і поўня ў небе».

*Уладзімір Караткевіч*. «Сякера пры дрэве» (другая кніга рамана «Каласы пад сярпом тваім»).

*Георгій Марчук*. «Давыд-гарадоцкія каноны» (2—3 навелы).

*Іван Навуменка*. «Вераніка».

*Іван Чыгрынаў*. «У ціхім тумане».

*Эрнэст Хэмінгуэй*. «Стары і мора».

*Іван Шамякін*. «Гандлярка і паэт».

### *Драматургія*

*Аляксей Дудараў*. «Радавыя».

*Алесь Петрашкевіч*. «Напісанае застаецца»; «Прарок для Айчыны».

*Іван Чыгрынаў*. «Следчая справа Вашчылы».

## АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПА ЛІТАРАТУРЫ Ў XI КЛАСЕ

Чытанне мастацкага твора і паўнавартаснае яго ўспрыманне.

Аргументаванне ўласных ацэнак герояў і падзей.

Выразнае чытанне мастацкіх твораў розных жанраў.

Складанне плана ўласнага вуснага і пісьмовага выказвання.

Разгорнутыя і сціслыя вусныя адказы на праблемныя пытанні, даклады і паведамленні на літаратурную тэму (з выкарыстаннем адной або некалькіх крыніц).

Тэзісы і канспекты літаратурна-крытычных артыкулаў па пытаннях літаратуры.

Сачыненні і рэфераты па праграмных творах.

Рэцэнзіі на самастойна прачытаную кнігу, прагледжаныя кінафільм, тэлеперадачу, спектакль, на твор жывапісу або музыкі.

Напісанне ўласных твораў (вершаў, невялікіх апавяданняў, мастацкіх замалёвак, эсэ і падобнага).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь:

- асноўныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў;
- асноўныя ідэйна-маральныя праблемы вывучаных твораў;
- асноўныя жанравыя і стылёвыя асаблівасці праграмных мастацкіх твораў;
- спецыфіку літаратуры як мастацтва слова, літаратурныя роды і жанры;
- асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці, прадугледжаныя дадзенай вучэбнай праграмай;
- асноўныя перыяды развіцця нацыянальнай літаратуры;
- асаблівасці, якія вылучаюць беларускую літаратуру сярод іншых літаратур свету, складаюць яе ўнікальнасць, адметнасць;
- асаблівасці рамантычнага, рэалістычнага і мадэрнісцкага тыпаў мастацкай творчасці;
- тэксты, рэкамендаваныя дадзенай вучэбнай праграмай для завучвання на памяць.

Вучні павінны ў м е ц ь:

- узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;
- аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці і аўтарскай пазіцыі;
- вызначаць асноўную праблематыку твора;
- выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;

- характарызаваць героя твора, супастаўляць герояў аднаго або некалькіх твораў;
- абгрунтоўваць сваю ацэнку прачытанага твора;
- весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;
- адрозніваць высокамастацкую літаратуру ад масавай;
- пісаць сачыненні на літаратурную тэму;
- карыстацца літаратуразнаўчымі крыніцамі і даведачнымі матэрыяламі (энцыклапедыямі, даведнікамі, слоўнікамі літаратуразнаўчых тэрмінаў, рэсурсамі глабальнай камп’ютарнай сеткі інтэрнэт і інш.).